**Тэма: “Графік ураўнення з дзвюма зменнымі. Ураўненне прамой”**

Мэта ўрока: забяспечыць фарміраванне ўяўленняў аб геаметрычнай інтэрпрэтацыі лінейнага ўраўнення з дзвюма зменымі.

Задачы ўрока:
*навучальныя:* стварыць умовы для засваення азначэння графіка ўраўнення з дзвюма зменымі, фарміравання ўяўленняў аб лінейным ураўненні з дзвюма зменнымі як аб ураўненні некаторай прамой;

*развіццёвыя:* садзейнічаць развіццю лагічнага мыслення, умення праводзіць аналогіі, выдзяляць галоўнае;

*выхаваўчыя:* стварыць умовы для выхавання культуры індывідуальнай і калектыўнай вучэбнай дзейнасці.

**Ход урока**

| **Дзейнасць настаўніка** | **Дзейнасць вучняў** |
|---|---|
| **I. Арганізацыйны момант** | |
| | Слухаюць, настройваюцца на работу. |
| **II. Актуалізацыя апорных ведаў** | |
| Заданне: 1)“Выберыце лінейныя ўраўненні з дзвюма зменнымі”, 2) “З зададзеных формуламі функцый выберыце лінейныя”.<br>Пытанні: 1) Ці ёсць падабенства паміж гэтымі ўраўненнямі?<br>2) Як вы лічыце чаму я праводжу аналогію менавіта паміж гэтымі ўраўненнямі?<br>Ці можаце сфармуляваць тэму нашага сённяшняга ўрока?<br>Якія задачы вы паставіце сабе на гэты ўрок? | Выконваюць заданне ў групах, прадстаўляюць вынік на дошцы .<br><br>Выказваюць меркаванні.<br><br><br><br>Фармулююць тэму урока. Запісваюць у сшытак.<br>Фармулююць задачы ўрока, план работы на ўроку. |
| **III. Фарміраванне новых ведаў** | |
| Заданне: Выразіце $y$ праз $x$ з ураўнення $3x - y = 6$.<br><br>Пытанні: 1) Ці з’яўляюцца дадзеныя ўраўненні раўназначнымі?<br><br>2) Якую функцыю задае формула $y = \frac{3}{2}x - 3$<br>$y = 3x - 6$ $y = 3x - 6$?<br>3) Што з’яўляецца графікам лінейнай функцыі?<br>Пабудаванне з дапамогай “Графопостроителя”<br><br>Заданне: 1) Пабудуйце графік функцыі $y = 3x - 6$<br>$y = 3x - 6$. | Выконваюць заданне ў групах, запісваюць вынік на дошцы.<br>Адказваюць на пытанні.<br><br><br><br><br>Выконваюць заданне ў групах, вынік прадстаўляюць на дошцы.<br><br><br>Робяць вывад. |

| | |
|---|---|
| 2) Ураўненні $0\cdot x - 2y = 6$.<br>$3x - 0\cdot y = 6$<br><br>Такім чынам, *графікам лінейнага ўраўнення з дзвюма зменнымі з'яўляецца прамая і наадварот: кожная прамая з'яўляецца графікам некаторага ўраўнення першай ступені з дзвюма зменнымі.*<br>Гэта ўраўненне называецца **ўраўненнем прамой.**<br>Геаметрычная інтэрпрэтацыя лінейнага ўраўнення з дзвюма зменнымі. | Працуюць з падручнікам. |
| **IV. Прымяненне атрыманых ведаў** | |
| № 3.34, (1,2), 3.36(3,4). | |
| **V. Рэфлексія** | |
| Выніковы тэст.<br>- якія задачы вы ставілі сабе ў пачатку ўрока?<br>- як вы лічыце, ці выкананы дадзеныя задачы?<br>- над чым трэба працаваць дома? | Выконваюць тэставае заданне, самакантроль(звяраюць з ключом).<br>Выказваюць свае думкі. |
| **VI. Дамашняе заданне.** | |
| П. 3.4, № 3.35(1,3), 3.36(5,6). | |